Сёння ў Менску адкрываецца першы тыраж выйгрышаў „Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР“

СОВЕЦКІ НАРОД З ВЕЛІЗАРНЫМ ЭНТУЗІЯЗМАМ ПАДТРЫМЛІВАЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗЫКІ, ЯКІЯ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ МАГУТНАСЦЬ НАШАЙ РАДЗІМЫ, ЯЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦЬ

ДАСТОЙНАЯ СУСТРЭЧА

З вялікім энтузіязмам сустракаюць ожны раз рабочыя нашага завода выускі дзяржаўных пазык. У нас няма аднаго рабочага, які-б не меў аблі-ацый «Пазыкі другой пяцігодкі» і Пазыкі ўмацавання абароны Саюза СР».

Кожны з нас добра разумее, што шы грошы ідуць на ўмацаванне ма-тнасці соцыялістычнай радзімы, на ічэ лепшае аснашчэнне баявой тэх-кай слаўнай Чырвонай Арміі і Ваен-а-Марскога Флота.

На нашы грошы пабудаваны сотні абрык, заводаў, МТС, больніц, ясель, кол. Возьмем, напрыклад, наш завод я Кірава. Што ён прадстаўляў з ся-гадоў 10 таму назад? Невялікія са-тужныя майстэрні, дзе выпускалі лькі насосы і кампедрабілкі. За го-двух сталінскіх пяцігодак завод ратварыўся ў буйнейшае прадпры-ства рэспублікі. Пабудован велізар-, светлы, прасторны новамеханічны х. Тут вырабляюцца складанейшыя анкі, якія разыходзяцца па ўсяму абсяжнаму Совецкаму Саюзу.

З кожным годам паляпшаюцца куль-рна-бытавыя ўмовы працоўных. Дзе-кі, сотні рабочых накіроўваюцца курорты, у дамы адпачынку за ит дзяржавы. Вось і я, напрыклад, калькі раз быў на курорце.

Усведамляючы велізарнае значэнне зык, я ахвотна аддаю свае зберы-ні на карысць і шчасце совецкага рода.

Радасныя дні перажывае зараз увесь парускі народ. Мы рыхтуемся да вя-кага ўрачыстага свята — да дня вы-раў у Вярхоўны Совет БССР. У гэ-я-ж дні рабочыя нашага завода го-а сустрэлі паведамленне аб тым, о ў Менску адбудзецца першы ты-к «Пазыкі ўмацавання абароны Са-а ССР». Гэта з'яўляецца для нас кім гонарам.

Кіраўны дастойна сустракаюць пер-тыраж, па-стаханаўску рыхтуюцца выбараў у соцыялістычны парла-нт. У кузнечным цэху, дзе я працую суваецца небывалы вытворчы ўздым ялічыліся рады энтузіястаў высо-прадукцыйнасці працы — стаха-цаў. Гэтыя поспехі будуць намі за-даваны і яшчэ больш памножаны.

І. П. ЛІПНІЦКІ,
майстар кузнечнага цэха Менскага завода імя Кірава.

ЯШЧЭ БОЛЬШ УМАЦУЕМ АБАРОНУ НАШАЙ РАДЗІМЫ

Першы тыраж пазыкі абароны супадае з днямі гарачай падрыхтоўчай работы да выбараў у Вярхоўныя Советы нашых саюзных рэспублік. На нашым заводзе працуе звыш сотні гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона Узбекскай ССР. Дзень выбараў стаханаўцы зашага завода сустракаюць новымі перамогамі ў сваёй соцыялістычнай працы. Я асабіста выконваю сваю норму ў сярэднім на 300 проц., стахановец-токар Іван Шахметаў выконвае норму на 310 проц.

Праноўныя нашай рэспублікі зажылі радасным і шчаслівым жыццём. З пачуццём вялікай радасці і любві ўзбекскі народ вылучыў сваімі першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета рэспублікі вялікага Сталіна і яго баявых саратнікаў.

«Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР» яшчэ больш умацавала боездольнасць нашай роднай Чырвонай Арміі. Нашы працоўныя рублі, пазычаныя дзяржаве, з'явіліся моцным ударам па падпальшчыках вайны — фашыстах і іх трацкісцка-бухарынскай агентуры.

Я шчыра вітаю працоўных Менска і ўсёй Беларусі з выпаўшым на іх долю гонарам — правядзеннем першага тыража пазыкі абароны ў сталіцы БССР.

СУЛТАН-УМАРАЎ,
стаханавец-фрэзероўшчык, фінактывіст ташкенцкага паравозарамонтнага завода імя Кагановіча.

ПРЫВІТАННЕ АД ПРАЦОЎНЫХ МАСКВЫ

Мне даручана перадаць шчырае прывітанне працоўным Менска і ўсёй Беларусі ад шматтысячнага калектыва рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў маскоўскага завода «Шарыкападшыпнік» імя Кагановіча.

За дні прабывання ў Менску я ўбачыла на справе як квітнее наша брацкая Беларуская Рэспубліка, якім цудоўным жыццём зажылі працоўныя пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і нашага любімага правадыра таварыша Сталіна.

Дваццаць дзён аддзяляюць нас ад гістарычнай даты — 26 чэрвеня — дня выбараў у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік.

Ва ўсіх кутках нашай вялікай радзімы совецкі народ выражае сваю гарачую, любоў і адданасць тварцу самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі, нашаму любімаму другу і настаўніку, першаму кандыдату ў дэпутаты Вярхоўных Советаў усіх нашых саюзных і аўтаномных рэспублік — таварышу Сталіну.

Партыя і народ, урад і народ, армія і народ — вось сіла большэвікоў, якая ў любы момант на сушы, на моры, пад вадой і ў паветры здолее нанесці сакрушальны ўдар ворагу, вось сіла, аб якую смяротна разаб'ецца ўсе ворагі совецкага народа.

«Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР» была выпушчана ў адказ на проіскі тройчы прэзрэнных бандытаў, шпіёнаў і здраднікаў радзімы тухачэўскіх, убарэвічаў, гамарнікаў і іншай нечысці.

Працоўныя чырвонай сталіцы — Масквы — падпісаліся на гэтую пазыку на 398.972 тысячы рублёў і поўнасцю аплацілі ўжо гэту падпіску.

Пад кіраўніцтвам нашай слаўнай комуністычнай партыі, совецкага ўрада і вялікага Сталіна наша радзіма мацнее і квітнее.

Пад гэтым выпрабавачым кіраўніцтвам мы пойдзем далей да новых і новых перамог.

Марфа Сцяпанаўна КУДЗЕЯРАВА,
старшыня камсода 1-га маскоўскага завода «Шарыкападшыпнік» імя Кагановіча.

СТАЛІНСКАЯ ДРУЖБА НАРОДАЎ СССР

Дружнай падпіскай на пазыку абароны ўсе калгаснікі і працоўныя, якім дарагі заваяванні нашай радзімы, адказалі на проіскі фашысцкіх гадаў — трацкісцка-бухарынскіх бандытаў.

Расце і мацнее сталінская дружба народаў нашай радзімы. Адной з яркіх ілюстрацый гэтай вялікай дружбы з'яўляецца пачынаючыйся сёння першы тыраж «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР», у якім удзельнічаюць прадстаўнікі ўсіх нашых 11 брацкіх саюзных рэспублік.

МАЛДЫБАЕЎ БЕГАЛЫ,
стаханавец, загадчык конегадоўчай фермы, фінактывіст калгаса «Кзыл-Аскер», Варашылаўскага раёна, Кіргізскай ССР.

БУДЗЕМ МАЦАВАЦЬ ФІНАНСАВУЮ МАГУТНАСЦЬ СССР

Першы тыраж «Пазыкі ўмацавання абароны СССР», які па рашэнню ўрада праходзіць ў сталіцы ордэнаноснай Беларускай рэспублікі, ускалыхнуў увесь калектыў дрэваапрацоўчага завода імя Молатава. Калектыў завода на працяту вось ужо 5 год трымае два пераходныя сцягі па фінансавай рабоце — ЦК саюза меблеўшчыкаў і Менскага гаркома КП(б)Б і горсовета. Напярэдадні тыража на заводзе праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Пры раздачы аблігацый агітатары вялі масава-растлумачальную работу ў цэхах, на выбарчым участку, на кватэрах. Яны расказвалі рабочым аб значэнні нашых пазык для соцыялістычнага будаўніцтва, аб тым, што нашы пазыкі ўсё больш і больш становяцца даходнымі для працоўных.

На агульным сходзе рабочыя абавязаліся сустрэць першы тыраж новымі вытворчымі перамогамі. Молатаўцы з гонарам выканалі данае слова. Вытворчы план за май выканан на 115 проц.

Калектыў завода абавязаўся выканаць поўгадовы план да 15 чэрвеня і да радаснага свята — выбараў у Вярхоўны Совет БССР — даць краіне звыш плана дадаткова на 250 тысяч рублёў прадукцыі.

А. А. КАРАСІК,
старшыня камсода менскага дрэваапрацоўчага завода імя Молатава.

НАРОДНЫЯ ПАЗЫКІ

Сёння ў Менску пачынаецца першы тыраж выйгрышаў «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР». Тыраж праходзіць ва ўмовах, калі беларускі народ з найвялікшым энтузіязмам і актыўнасцю рыхтуецца да выбараў Вярхоўнага Совета БССР. Усе працоўныя Совецкай Беларусі бязмежна шчаслівы і горды вялікім гонарам, які аказалі нам мудры правадыр народаў таварыш Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі, даўшы згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета нашай ордэнаноснай рэспублікі.

Правядзенне тыража ў сталіцы БССР будзе садзейнічаць яшчэ лепшаму поспеху выбарчай кампаніі. Беларускі народ выбярэ ў Вярхоўны Совет рэспублікі лепшых сыноў і дачок нашай радзімы, да канца адданых партыі Леніна—Сталіна.

З года ў год у нашай краіне павышаюцца народныя даходы, павялічваюцца нажапленні соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, расце дзяржаўны бюджэт.

На базе соцыялістычнай уласнасці расце добрабыт народных мас. Аб гэтым ярка сведчаць наступныя лічбы. У мінулым годзе народны даход СССР дасягнуў сумы 100 мільярдаў рублёў, перавысіўшы даваенны размер народнага дахода ў 5 раз. Фонд зарплаты ў мінулым годзе перавысіў 80 мільярдаў рублёў. Рознічны тавараабарот склаў 143 мільярды рублёў.

Падпіска на нашы пазыкі заўсёды ператвараецца ў дэманстрацыю гарачай адданасці совецкага народа партыі Леніна—Сталіна, яго бязмежнай любві да сваёй радзімы.

Аблігацыя пазыкі — сведчанне актыўнага ўдзелу ў фінансаванні соцыялістычнага будаўніцтва. На сродкі ад пазык пабудаваны ў нашай краіне тысячы новых заводаў, фабрык, соўгасаў, МТС, школ, клубаў, больніц, ясель і т. д.

Беларускі народ разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза актыўна ўдзельнічае у рэалізацыі выпускаемых ўрадам пазык. Больш паўтара мільёна чалавек у БССР з'яўляюцца трымальнікамі дзяржпазык на агульную суму каля 500 мільёнаў рублёў.

У адказ на спробы фашысцкіх падпальшчыкаў вайны, трацкісцка-бухарынскіх агентаў германа-японска-польскага фашызма пахіснуць магутнасць нашай краіны, беларускі народ разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза адказалі дружным удзелам у падпісцы на «Пазыку ўмацавання абароны Саюза ССР». «Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР» была размешчана ў нашай краіне ў найкарацейшы тэрмін з перавышэннем сумы выпуску на 915 мільёнаў рублёў.

З кожным годам расце база развіцця нашых дзяржаўных пазык, расце матэрыяльны добрабыт працоўных.

Вялікі рост зберажэнняў працоўных і ў БССР. Агульны размер астатку ўкладаў у ашчадкасах БССР дасягнуў больш 121 мільёна рублёў, у той час, калі ў пачатку першай пяцігодкі астатак укладаў складаў усяго чатыры з паловай мільёна рублёў. Значна ўзрасла колькасць укладчыкаў ашчадкас БССР. Калі ў 1928 г. было 100,8 тысяч чалавек, то на 1 студзеня 1938 года колькасць укладчыкаў дасягае 365 тысяч чалавек.

Правядзенне тыража «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР» у Менску будзе спрыяць яшчэ большаму ўмацаванню абароназдольнасці БССР — баявога фарпоста Совецкага Саюза на граніцах з капіталістычным Захадам. Аб росквіце нашай слаўнай соцыялістычнай радзімы, аб умацаванні яе абароназдольнасці клапоціцца кожны чэсны грамадзянін — совецкі патрыёт.

Будзем яшчэ з большай любоўю ўмацоўваць нашу Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, каб ні адзін вораг не пасмеў пасягнуць на граніцы нашага вялікага Совецкага Саюза.

Г. О. ВАКСМАН,
намеснік начальніка ўпраўлення ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР.

ВЫДАТНЫЯ ПЕРАМОГІ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Вялікія сродкі ўкладвае наша дзяржава ў гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. За годы совецкай улады пабудаваны тысячы школ, радыёвузлоў, гаражоў, лазняў, кіно, тэатраў і т. д. Больш паловы дзяржаўнага бюджэта ўходзіць на развіццё культуры і асветы.

Партыя Леніна—Сталіна, соцыялістычны лад прынеслі шчасце народам нашай краіны. Жывучы заможным жыццём, працоўныя аддаюць у пазыку сваёй дзяржаве сотні мільёнаў рублёў. Па нашаму Энбекшы-Казахскаму раёну Казахскай ССР пазыка абароны рэалізавана на 393.600 рублёў. 311 тысяч рублёў складаюць уклады працоўных нашага раёна ў ашчадныя касы.

За дні прабывання ў Менску я знаёміўся з радам прадпрыемстваў, пабываў у тэатрах, музеях, кіно. Вялікія дасягненні сталіцы Беларускай рэспублікі сталі магчымы толькі ў выніку перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі і вялікай дружбы народаў нашай краіны.

БАТАЛАЎ ТАГЛЫН,
загадчык перадавой раённай ашчадкасы Энбекшы-Казахскага раёна, Казахскай ССР

РАДАСНАЯ ПАДЗЕЯ ЛЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Н. Я. НАТАЛЕВІЧ
В. а. старшыні ЦВК БССР, старшыня тыражнай камісіі.

* * *

ялікі гонар вы-нашай Бела-кай рэспублікі: ня ў Менску па-наецца першы таж «Пазыкі ўма-ання абароны Саюза ССР». Гэта дзея з'яўляецца радасным святам ўсяго беларускага народа.

галечы і бяспраўі празябалі да олюцыі працоўныя Беларусі. 14.000 ешчыкаў і купцоў, цэрквы і мана-ры ўладалі 9 мільёнамі дзесяцін лі, а 564 тысячы сялянскіх гаспа-дак мелі ўсяго 5 мільёнаў дзесяцін. ні і тысячы беднякоў з былых Мен-й, Віцебскай, Магілеўскай губерній раўляліся за «шчасцем» у Амары-у далёкую Сібір. Да гэтага часу аваліся яшчэ некаторыя старыя вы беларускіх вёсак Мохаеды, Ка-ды і інш. Тут пяклі хлеб папалам якінай і карой.

ялікі рускі паэт Нікалай Аляксеевіч расаў у сваіх выдатных творах азаў сапраўднае становішча бела-кага народа, які доўгія годы па-ваў ад нацыянальнага і соцыяльна-нёту царскага самадзяржаўя:

Видишь, стоит изможден
лихорадкою,
Высокорослый, больной белорусс:
Губы бескровные, веки упавшие,
Язвы на тощих руках.
Вечно в воде по колено стоявшие
Ноги опухли, колтун в волосах.
Смою грудь, что на заступ
старательно
Изо дня в день налегала весь век...
Вы приглядись к нему, Ваня,
внимательно.
Трудно свой хлеб добывал человек».

Горкая праўда была ў гэтых словах найвялікшага з рускіх паэтаў.

Непазнавальнай стала Совецкая Беларусь пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. За годы совецкай улады пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і геніяльнага Сталіна, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа, былая царская калонія ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку з развітай прамысловасцю, з механізаванай сельскай гаспадаркай.

За годы двух сталінскіх пяцігодак у рэспубліцы створаны зусім новыя галіны прамысловасці: машынабудаўнічая, хімічная, тарфяная, штучнага шоўку, трыкатажная, швейная. Пабудаваны такія першакласныя прадпрыемствы, як гомельскі завод сельскагаспадарчых машын, шклозавод імя Сталіна, крычаўскі цэментны завод, магілеўская шоўкавая фабрыка, Белдрэс імя Сталіна і інш. Аб'ём валавой прадукцыі прадпрыемстваў БССР у 1937 годзе склаў каля 2 мільярдаў рублёў — у 21 раз больш, чым у 1913 годзе.

На калгасных палях Беларусі, дзе калісьці цягнуў саху і драўляную барану змораны конік, зараз працуюць трактары, камбайны, аўтамашыны. У гэтым годзе на палях рэспублікі працуюць звыш 8 тысяч трактараў, 120 камбайнаў, звыш 3 тысяч аўтамашын. Беларуская вёска мае добра абучаныя кадры спецыялістаў, вырасшыя з асяроддзя калгаснікаў. У калгасах БССР працуе звыш 800 аграномаў, 22 тысячы трактарыстаў, 1116 камбайнераў, 2025 машыністаў малатарань, 1098 ільнацерабільшчыкаў і інш.

Да рэволюцыі царскі ўрад усімі мерамі стараўся трымаць у цемры і невуцтве народы Беларусі. Звыш 75 проц. насельніцтва было непісьменным, а непісьменных жанчын было 90 проц. Зусім мізэрнай была колькасць школ і бібліятэк. Затое было 3000 пэрквяў, 704 сінагогі, 113 касцёлаў і 5 тысяч «манаполек».

Зараз Совецкая Соцыялістычная Беларусь — рэспубліка суцэльнай пісьменнасці. У 7 тысячах школ навучаецца больш мільёна дзяцей. У 23 вышэйшых навучальных установах, у 97 тэхнікумах займаюцца каля 50 тысяч студэнтаў. Дзесяткі тысяч дарослых рабочых, калгаснікаў павышаюць свае веды ў вячэрніх рабочых і калгасных школах. Толькі за алзін 1937 год на навучанне дарослага насельніцтва было выдаткавана 27 мільёнаў рублёў.

Каля 340 гукавых кіноўстановак налічваецца ў нас, сотні кінаперасовак, 15 тэатраў, 259 клубаў, больш 2000 чырвоных куткоў, каля паўтара тысяч хат-чытальнь, 90 дамоў соцкультуры.

Аб росквіце рэспублікі ярка сведчыць няўхільны рост яе бюджэта. У 1923—24 гг. бюджэт БССР складаў усяго толькі 16 мільёнаў рублёў, у 1937 годзе — 932 мільёны рублёў — рост амаль у 60 разоў. Выдаткі на народную гаспадарку выраслі з 3 мільёнаў у 1923—24 годзе да 159 мільёнаў у 1937 годзе. На соцыяльна-культурныя мерапрыемствы адпаведна з 7 мільёнаў рублёў да 677 мільёнаў, у тым ліку выдаткі на асвету выраслі з 5 мільёнаў да 479 мільёнаў рублёў, на ахову здароўя — з 1.700 тысяч да 187 мільёнаў рублёў.

Ярка характарызуюць павышэнне добрабыту беларускага народа лічбы ўкладаў у ашчадныя касы і размяшчэння совецкіх пазык. На 1 кастрычніка 1930 года астатак укладаў у ашчадкасы рэспублікі складаў 11,5 мільёна рублёў, на 1 студзеня 1938 года ён павялічыўся ў 10 разоў — 110,8 мільёна рублёў. За 6 год — з 1932 па 1938 — сярэдні ўклад працоўнага павялічыўся больш чым у 12 разоў. У 1932 годзе ён складаў 25 р. 40 кап., а сёлета — 303 р. 50 кап.

Калі ў 1927 годзе на «Першую пазыку індустрыялізацыі» працоўныя Беларусі падпісаліся ў размеры 2,7 мільёна рублёў, то ў 1937 годзе «Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР» была размешчана ў размеры 95 мільёнаў рублёў. Паўтара мільёна працоўных рэспублікі з'яўляюцца трымальнікамі гэтай пазыкі. Пазыкі гэтыя аказаліся сур'ёзнай крыніцай даходу працоўных БССР. Толькі за апошнія 5 год даход насельніцтва рэспублікі ад пазык склаў 87 мільёнаў рублёў.

Поспехі Беларусі велізарны. Але яны былі-б яшчэ больш значнымі, калі-б прэзрэнныя ворагі народа — трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія шпіёны і бандыты не напкодзілі ў соцыялістычнай прамысловасці не знішчалі жывёлу, не зніжалі ўраджайнасці. Дзякуючы комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну, дзякуючы пільнасці слаўнай совецкай разведкі, пад кіраўніцтвам сталінскага наркома Нікалая Іванавіча Ежова была разгромлена і знішчана подлая банда шпіёнаў і шкоднікаў. Совецкая Беларусь мае магчымасць далей паспяхова будаваць сваё шчаслівае, радаснае і заможнае жыццё.

Не выпадкова першы тыраж пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР адбываецца іменна ў Совецкай Беларусі, у магутным фарпосце нашай вялікай краіны соцыялізма, дзе кожны працоўны з'яўляецца вартавым на граніцы з капіталістычнымі фашысцкімі дзяржавамі, дзе кожны працоўны гатоў да апошняй кроплі крыві біцца з ворагам, гатоў абараняць кожную пядзь роднай совецкай зямлі.

Рэалізацыю «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР» беларускі народ разглядаў, як неадлучную частку барацьбы за ўмацаванне міру, за падняцце абароназдольнасці краіны, як адну з мер, накіраваных да яшчэ большага аснашчэння нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога флота навейшай тэхнікай, да абуздання грабежніцкіх апетытаў фашысцкіх агрэсараў.

У часе рэалізацыі «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР» працоўныя Беларусі паказалі ўзоры высокай палітычнай свядомасці. У гарадах і сёлах было разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне падпіскі на пазыку, якая была размешчана ў найкарацейшыя тэрміны.

Першы тыраж «Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР» праходзіць у гістарычныя, радасныя для нашай ордэнаноснай рэспублікі дні — у дні выбарчай кампаніі. Беларускі народ ганарыцца высокім давер'ем, якое аказалі яму вялікі Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі таварышы Молатаў, Каганановіч, Калінін, Варашылаў, Ежоў, Жданаў, Мікаян, Андрэеў, даўшы згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

26 чэрвеня — у вялікі ўрачысты дзень — рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя нашай пагранічнай рэспублікі яшчэ і яшчэ раз прадэманструюць сваё маральна-палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, сваю гатоўнасць абараняць шчаслівую, квітнеючую соцыялістычную радзіму, сваю гарачую беззаветную адданасць совецкаму ўраду, большэвіцкай партыі, свайму другу, правадыру і настаўніку — любімаму Сталіну.

ВОПЫТ НАШАЙ РАБОТЫ

У пачатку гэтага года мяне вызначылі брыгадзірам трактарнай брыгады Разумеючы ўсю адказнасць данай работы, я адразу-ж распачаў рамонт трактараў. Кожная дэталь, кожны вінцік у трактарах быў праверан мною і трактарыстамі маёй брыгады. Старэйшы трактарыст са шматгадовым вопытам Пётр Сідаравіч Бохан сваімі карыснымі парадамі дапамог нам дабіцца добрага рамонту ўсіх трактараў нашай брыгады.

Палявыя работы мы сустрэлі ў поўнай гатоўнасці. Кожны трактарыст добра ведаў участкі работы, у брыгадзе быў складзен графік руху трактараў. З першых-жа дзён работы мы ўключыліся ў спаборніцтва з брыгадай тав. Сафроненка. У дагаворы социялістычнага спаборніцтва мы абавязаліся за сезон выпрацаваць на кожны з трох трактараў нашай брыгады (трактары ХТЗ) па 1.500 гектараў у пераводзе на мяккае ворыва. Абавязаліся не мець прастояў, аварый і паломак.

З першых-жа дзён работы кожны з нас дабіўся сістэматычнага перавыкнання норм выпрацоўкі. Пётр Бохан і яго напарнік Васілій Фёдаравіч Гарлан штодзень узорвалі па 7 і больш гектараў за змену, пры норме 4,2.

Трактары працавалі круглыя суткі. Беручы прыклад з Пятра Сідаравіча, маладыя трактарысты Васіль Снапок, Нікалай Мятлоў, Пётр Валенцік і Дзімітрый Пенцюх таксама дабіліся сістэматычнага перавыканання норм выпрацоўкі.

Да 5 мая мы поўнасцю выканалі план сяўбы па нашаму ўчастку і пераключыліся на дапамогу адстаючым брыгадам. Зараз мы працуем па пад'ёму цаліны і на ворыве папараў. За час палявых работ мая брыгада выпрацавала ў пераводзе на мяккае ворыва 1.100 гектараў, пры гадавым плане 1.200 гектараў. Зэканомлена 1.900 кілограмаў гаручага.

Найлепшых вынікаў дабіўся Пётр Сідаравіч Бохан. Ён выпрацаваў 408 гектараў і зэканоміў 986 кілограмаў гаручага. Гэтымі поспехамі мы заваявалі пярэшнства па МТС і занялі адно з першых месц па Віцебскай вобласці.

Як мы дабіліся такіх поспехаў? У нас была добрая арганізацыя працы. Не было ні аднаго выпадку прагулаў або спазнення на работу. Не было прастояў, аварый і паломак.

Дырэктар МТС тав. Савіцкі акружыў нашу брыгаду шчырымі клопатамі. Ён не раз даваў нам карысныя парады, дапамагаў шырока разгортваць палітмасавую работу сярод трактарыстаў.

Падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР мы спалучаем з нашай стаханаўскай работай на палях. Мы абавязаліся правесці цераблённе ільну на плошчы ў 100 гектараў (план 60) і гадавы план работы выканаць не менш, як на 300 проц. Гэтым мы заваюем пярэшнства па вобласці, заваюем ганаровае званне стаханаўцаў социялістычных палёў.

Іван Аляксандравіч БОХАН,
брыгадзір 8-й трактарнай брыгады Боркавіцкай МТС Дрысенскага раёна.

НЕ РЫХТУЮЦЦА ДА КАСЬБЫ

ПОЛАЦК. У мінулым годзе большасць калгасаў Дамнікоўскага сельсавета касьбу пачалі позна і неарганізавана. У выніку ў калгасе «Большэвік» асталося няўбранымі каля 30 гектараў сенажаці. Аднак гэта не паслужыла ўрокам кіраўнікам калгасаў.

У гэтым годзе ў калгасе «Большэвік» не разгарнулі падрыхтоўчых работ да ўборачнай кампаніі. Толькі тыдзень таму назад забаранілі пасвіць жывёлу на сенажаці, а ў другой брыгадзе гэтага-ж калгаса яшчэ і зараз на сенажаці пасуцца цяляты.

Сонаўборачны інвентар у калгасе няспраўны. Дзве касілкі і грабілка стаяць заржавеўшымі. Касілка, якая замацавана за першай брыгадай, таксама няспраўна — паламаны дышлы і зуб'я.

З-за нясвоечасовай падрыхтоўкі і недахопаў сенавалаў у мінулым годзе сена складалі пад адкрытым небам. Аднак і зараз ні ў адным з пяці сенавалаў другой брыгады класці сена нельга. У двух сенавалах стаіць жывёла, а ў астатніх пагнілі і працякаюць стрэхі.

Аналагічнае становішча і ў калгасе імя Валадарскага, гэтага-ж сельсавета. Калгас павінен убраць 305 гектараў натуральнай сенажаці і 35 гектараў канюшыны. Для гэтага ў калгасе ёсць толькі 3 касілкі (адна з іх няспраўная) і дзве грабілкі — таксама няспраўныя. Таму большую плошчу сенажаці калгас будзе ўбіраць уручную. Але-ж для гэтага ў калгасе нехапае кос і няма брускоў. Да таго-ж, у калгасе травяць сенажаць. У абедзены перапынак на сенажацях пасуць коней. Адказны за ахову сенажацей палявод Васіль Міжешка не прымае дзейсных мер для зберажэння іх.

В. БЫХАУЦОЎ.

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ

КРАСУЕ АЗІМАЕ ЖЫТА

КАМАРЫН. Пачало красаваць азімае жыта, якое дасягае месцамі росту 160 сантыметраў. Густыя і зялёныя стаяць азімыя пасевы на палях брыгады тав. Мельніка з калгаса «III Інтэрнацыянал». Выдатна расце азімае жыта ў калгасе «Чырвоная Украіна» на асушаных балотах плошчай у 98 гектараў. Брыгадзір тав. Шпэтны чакае сярэдняга ўраджаю ў 30 цнт. з гектара.

Прайшоўшыя дажджы і ўстанавіўшаяся цёплае надвор'е спрыяюць хуткаму росту яравых і ільну. Лён вышаў у ёлку, дасягнуўшы на асобных участках 35 сант.

Калгасы «Дняпроўскі араты», «III Інтэрнацыянал», «Ленінскі шлях» закончылі другую праполку ільну. Стаханаўка-звеннявая з калгаса імя Ільіча Галя Іваненка прапалола два разы лён і закончыла першую праполку ўсіх яравых на ўчастку звяна.

У гэтых калгасах і па ўсяму раёну азімыя і яравыя пасевы знаходзяцца ў добрым становішчы. Калгаснікі заяўляюць, што ўраджай у гэтым годзе будзе значна большы, чым у мінулым годзе.

ЛЁН ВЫШАЎ У ЁЛАЧКУ

ЛЁЗНА. Становішча ільняных пасеваў ўсюды добрае. Усходы дружныя, рослыя. Асабліва добра расце лён у звеннях «тысячніц».

У звяне стаханаўкі Тацьяны Яўневіч з сельгасарцелі імя Чапаева лён вышаў у ёлачку. Вышыня ільну — 10—12 см. На сцяблах з'явілася да 10 лісткоў. Выходзіць лён ёлачкай і ў калгасе «Апора советаў» і «Бязбожнік». Большасць калгасаў раёна прыступілі да першай праполкі. Добра арганізавана праполка ў калгасе «Вольнае жыццё», Касцееўскага сельсовета. На праполцы арганізавана індывідуальная здзельшчына.

Да пастановак Маскоўскага тэатра Рэволюцыі ў Менску. НА ЗДЫМКУ: сцэна з 3-га акта 2-й карціны п'есы «Праўда» — А. Карнейчука.

УСЕБЕЛАРУСКІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ Ф ЗКУЛЬТУРНЫЯ СВЯТЫ

ЦК ЛКСМБ, Камітэт па справах фізкультуры і спорта пры СНК БССР і Наркамат асветы зацвердзілі план масавых спартыўных мерапрыемстваў сярод школьнікаў на летні перыяд.

Пасля сканчэння вучэбнага года па рэспубліцы адбудуцца гаралскія і раённыя фізкультурныя святы школьнікаў. З 22 па 25 чэрвеня ў Менску будуць праводзіцца ўсебеларускія гімнастычныя школьныя спаборніцтвы, у якіх прымуць удзел калектывы 12 гарадоў рэспублікі. З 20 чэрвеня пачнецца ўсебеларускі розыгрыш на кубак БССР па футболу. У рэспубліканскі Камітэт па справах фізкультуры і спорта паступілі ўжо заяўкі на ўдзел у розыгрышы ад калектываў юных фізкультурнікаў 23 гарадоў і раёнаў. Падрыхтоўваецца ўсебеларуская спартакіяда піонераў і школьнікаў па лёгкай атлетыцы і плаванню, якая адбудзецца ў ліпені. На гэтай спартакіядзе будзе адабрана каманда для ўдзелу ў надыходзячых усесаюзных дзіцячых спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы ў Кіеве. Лепшыя школьнікі-фізкультурнікі Менска прымуць удзел ва ўсесаюзным розыгрышы на кубак СССР па футболу. Розыгрыш пачнецца з 12 ліпеня.

Дырэктарам стадыёнаў, водных станцый і іншых фізкультурных баз прапанавана забяспечыць бясплатнае абслугоўванне дзяцей у летні перыяд з прадастаўленнем неабходнага спартыўнага інвентара. Для дзяцей павінны быць арганізаваны спартыўныя пляцоўкі па валейболу, гараджах, па баскетболу, кракету і інш.

МЭБЛЯ ДЛЯ ШКОЛ

Па дрэваапрацоўчых прадпрыемствах Віцебска, Магілева, Рэчыцы і Мазыра размеркаван буйны заказ органаў народнай асветы БССР на выраб спецыяльнай школьнай мэблі. Да новага вучэбнага года школы рэспублікі атрымаюць 11.600 парт, 176 вешалак, 554 класных дошак, 1.135 сталоў, 2.573 стулляў і 799 шафаў. У параўнанні з мінулым годам вытворчасць школьнай мэблі павялічваецца на 70—80 проц.

ВЕЛІЗАРНЫ ПОСПЕХ

З 5 мая г. г. у калгасах Дрысенскага раёна дэманструецца фільм «Ленін у Кастрычніку».

Працоўныя раёна даўно чакалі гэтага выдатнага фільма, каб убачыць вобраз вялікага настаўніка—Уладзіміра Ільіча Леніна. Памяшканні, дзе дэманструецца кінофільм, заўсёды перапоўнены. Пасля сеанса доўга не разыходзяцца старыкі, моладзь, дзеці. Дзеляцца ўражаннямі аб прагледжанай карціне, аб ігры асобных артыстаў.

На 27 кіносеансах прысутнічала больш 6.000 чалавек.

В. ЗЕЛЯНЬКЕВІЧ.

ТЭАТР „РОМЭН" ЗАКАНЧВАЕ ГАСТРОЛІ У МЕНСКУ

Заўтра заканчвае свае гастролі ў Менску Маскоўскі цыганскі тэатр «Ромэн». За 21 дзень работы тэатр паказаў у Менску 24 спектаклі. Усе спектаклі праходзілі з вялікім поспехам. Тэатр абслужыў 15.600 гледачоў. Найбольшым поспехам карысталіся спектаклі «Цыганы» — па аднаіменнай паэме А. С. Пушкіна, «Вечар цыганскай песні і пляскі» і «Свадзьба ў табары».

Апрача асноўнай работы — паказу спектакляў цыганскі тэатр «Ромэн» правёў вялікую работу па абслугоўванню выбаршчыкаў на выбарчых участках і ў чырвонаармейскіх часцях. Праведзена 9 выездаў на прадпрыемствы і ў чырвонаармейскія лагеры, дзе абслужана 12 тысяч гледачоў. З вялікім поспехам тэатр выступаў на заводзе імя Варашылава, дзе прысутнічала 1.500 чалавек, «Большэвік»—600 чалавек, фабрыка імя Крупскай — 1.000 чалавек і інш.

Тэатр выступаў на 4-й акруговай партыйнай канферэнцыі войск НКВД Беларускай акругі і Менскай гаралской партыйнай канферэнцыі.

Заўтра тэатр выязджае на гастролі ў Магілеў і потым у Гомель.

— Калектыў тэатра, — заявіў у гутарцы з нашым карэспандэнтам дырэктар тэатра тав. Красоўскі, — і надалей будзе прымаць актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Зараз тэатр заканчвае падрыхтоўку спецыяльнай інтэрмедыі, прысвечанай выбарам у Вярхоўны Совет БССР, якая будзе паказвацца кожны дзень перад пачаткам спектакля.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

ПІСЬМО ГЕРМАНСКІХ РАБОЧЫХ ЧЭХАСЛАВАЦКІМ НЕМЦАМ

ПРАГА, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). Група рабочых раду буйных прадпрыемстваў Берліна звярнулася да судэта-нямецкага насельніцтва Чэхаславакіі з пісьмом, у якім, між іншым, сказана:

«Мы з вялікай зацікаўленасцю сочым за падзеямі ў Чэхаславакіі. Яны маюць рашаючае значэнне не толькі для вас, але і для нас, немцаў, жывучых у Германіі. Гутарка ідзе аб навісшай пагрозе новай братазабойчай бойні. Не верце байкам, якія вам расказваюць, нібы за патрабаваннямі Генлейна стаіць германскі народ, быццам германскі народ прагне далучэння Судэцкай вобласці да Германіі. Не! Гэтага дабіваюцца толькі Гітлер і германскія міліянеры. Германскі народ не падтрымлівае Гітлера, ператварыўшага 60 мільёнаў немцаў у рабоў. Вы не знойдзеце ў гітлераўскай Германіі таго, што вам абяцае Генлейн. Вы маеце свабоду выбараў, дэмакратычных органаў улады, свабоду думак, арганізацый і друку. У нас-жа нічог тага няма.

Нямецкія юнакі! У Германіі равесніка абавязаны праходзіц цяжкай працоўнай павіннасці і д ды ваеннай службы. Тры годы неючай маладосці страчаны мар.

Нямецкія дзяўчаты! У Герман шы сёстры-равесніцы абавязаны ны год летам выконваць цяжку боту ў памешчыка і кулака за марак у месяц.

Працоўныя немцы ў Германіі рымліваюць гарматы замест хлеб ражываюць дарагоўлю, няхватку відаў тавараў і пагоршанне якас вараў.

Рабочыя і сяляне, рамеснікі і генты не ідуць за Гітлерам. Н майце, што мы пойдзем заваяв далучыць вас да Германіі. Мы мір.

Чэшскі народ падае вам руку кліча разам будаваць дэмакрат дзяржаву. Адкажыце яму моцны капаціскапнем».

ВЫСТУПЛЕННЕ ЧЭРЧЫЛЯ СУПРОЦЬ ПАЛІТЫКІ НЕЎМЯШАН

ЛОНДАН, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора вядомы кансерватыўны дзеяч Уінстон Чэрчыль выступіў з прамовай у Бірмінгаме. Закранаючы становішча ў Іспаніі, Чэрчыль заявіў: «Нельга не абурацца, калі бачыш бессаромную інтэрвенцыю двух еўрапейскіх фашысцкіх краін, праводзімую пад фальшывым спягам «неўмяшання». Франко, — сказаў далей Чэрчыль,—не мог-бы прасунуцца ўперад ні на крок, каб ён не абапіраўся на войскі інтэрвентаў. Пры такім становішчы нельга праводзіць палітыку «нейтралітэта».

Адзначыўшы, што англа-італьян згода не павінна ўступіць у сіл тых пор, пакуль італьянскія войс будуць адкліканы з Іспаніі, Чэ указаў, што англійскаму і італь му ўрадам прыдзецца доўга чака куль рэспубліканская Іспанія сп супраціўленне. Усякая спроба а Італіі фінансавую дапамогу, паку войскі астаюцца ў Іспаніі, сус ражучы адпор з боку англійскаг рода».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Згодна афіцыяльнай зводкі іспанскага міністэрства абароны за 3 чэрвеня, у сектары Сорта (на поўнач ад Трэмпа) новыя атакі мяцежнікаў на пазіцыі рэспубліканцаў у Піедрас дэ Аоло былі поўнасцю адбіты. У правінцыі Тэруэль ваенныя дзеянні на працягу ўсяго дня не спыняліся. Атакі мяцежнікаў былі накіраваны галоўным чынам на паўднёвы ўсход ад Тэруэля. Паблізу ад Пуэбла дэ Вальвердэ мяцежнікі пробавалі абыйсці дарогу на Сагунта, аднак рэспубліканскія войскі прымусілі мяцежнікаў адступіць. Праціўнік ужо на працягу трох ты без поспеху прабуе атакаваць па рэспубліканцаў ля Мора дэ Руб Рэспубліканскія войскі прадаўж утрымліваць гэтую вёску, адбів ўсе атакі праціўніка. Рад атак цежнікаў супроць узвышша М (паблізу ад Мора дэ Рубілос) насцю адбіт. Рэспубліканцы зах палонных і ваенныя прыпасы.

Рэспубліканская авіяцыя падв моцнай бамбардыроўцы аэрадромь цежнікаў у Саулэ і Ла Сеніа. У ветраным баі рэспубліканцы адзін фашысцкі самалёт.

У ТЫЛУ ФАШЫСЦКІХ МЯЦЕЖНІКАЎ

БАРСЕЛОНА, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). Навара — найбольш рэакцыйная вобласць, іспанская Вандэя — лічылася да апошняга часу самым моцным аплотам фашысцкіх мяцежнікаў. І імя гэта вобласць прычыняе цяпер больш за ўсё непакою генералу Франко і яго берлінскім і рымскім гаспадарам.

Паўстанне ў форце Сан-Крыстобаль не з'явілася ізаляваным актам. Да зняволеных, якіх налічвалася да 1000 чалавек, далучыліся многія салдаты і мясцовыя жыхары.

З агульнай колькасці паўстаўшых — 85 чалавек былі затрыманы паліцыяй мяцежнікаў, каля 300 чалавек перайшлі французскую граніцу. Астатнія парашылі астацца на іспанскай тэрыторыі, каб падняць супроць інтэрвентаў насельніцтва правінцый Сарагосы, Лагроньо і Гіпускої.

Амаль адначасова з падзеямі ў форце Сан-Крыстобаль адбыліся ўзброеныя сутычкі ў радзе месц правінцыі Касерэс (Эстрэмадура).

Раздоры ў лагеры мяцежнікаў існуюць ужо даўно, з самага пачатку мяцежа. Барацьба ішла тады, галоўным чынам, паміж фалангістамі і карлістамі. Яны змагаліся за пасады, за пераважаючы ўплыў у армії і т. п. Цяпер-жа падзеі прынялі іншы абарот. Уся нянавісць накіроўваецца на тэрвентаў-акупантаў.

Незадаволенне паглыбляецца, што ў апошні час у акупаванай ны Іспаніі пануе сапраўдны голад гэтым сведчаць артыкулы ў газ якія выдаюцца ў Бургосе, Валья дзе, Севільі.

Бясспрэчна, што па меры дале га ўмацавання рэспубліканскай а якая гераічна зражаецца пад ло гам: «Супраціўляцца сёння, каб на паць заўтра», разлажэнне ў тылу цежнікаў і інтэрвентаў будзе рас

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКА НА ПАЗЫКУ УМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ САЮЗА ССР

Рабочыя і служачыя, якія падпісся на Пазыку Умацавання Абар Саюза ССР, выплацілі апошні ўзно сваёй падпісцы на пазыку з зара най платы за другую палову краса гэтага года.

Адначасова з уплатай апошняга носу бухгалтэрыя прадпрыемства ўстаноў выдавала на рукі падпісчы аблігацыі пазыкі.

Калгаснікам і сялянам-аднаасобні аблігацыі выдаваліся сельскімі сов мі неадкладна па выплаце кожным іх апошняга ўзносу па падпісцы на зыку.

Неатрыманыя падпісчыкамі аблігацыі здадзены бухгалтэрыяй прадпрыем ваў і ўстаноў, а таксама сельскімі ветамі ў ашчадныя касы.

Грамадзяне, якія падпісаліся на зыку Умацавання Абароны Саюза С і па якіх-небудзь прычынах не ат малі да гэтага часу аблігацый, мог атрымаць іх у цэнтральных ці ра ных ашчадных касах па месцу п піскі.

Для атрымання аблігацый рабочы служачыя павінны прадставіць дав ку ад бухгалтэрыі прадпрыемства ўстановы аб суме ўплачаных узно па падпісцы, а калгаснікі і сяляне-н наасобнікі — застаўшуюся ў іх на а ках разліковую квітанцыю па пазы

Аблігацыі перададзены бухгалтэры прадпрыемстваў, устаноў і сельскі советамі ў ашчадныя касы без зак павання за падпісчыкамі нумароў. таму да атрымання на рукі аблігац падпісчыкі не могуць прымаць удзе ў тыражах выйгрышаў па пазыцы.

ГАЛОЎНАЕ УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖ ПРАЦАШЧАДКАС І ДЗЯРЖКР ДЫТУ.

—О—

АД РЭДАКЦЫІ

28 лістапада 1937 года ў «Звяздзе» бы змешчан артыкул пад загалоўкам «Наркомгасе арудуюць ворагі». Правіл на ўскрываючы шкодніцкую дзейнасц ворагаў народа, якія ў той час сядзе ў Наркомгасе, разам з гэтым у арты куле былі беспадстаўна прад'яўлен сур'ёзныя абвінавачанні былому н чальніку Электракіраўніцтва тав. Н. Дэнісу. Абвінавачанні тав. Дэніса п пацвердзіліся.

Гэтым рэдакцыя выпраўляе сваю п мылку.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ

МАСКОЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР РЭВОЛЮЦЫІ (памяшк. Дзярж. яўрэйскага тэатра)
5 чэрвеня Шэкспір
РОМЕО І ДЖУЛЬЕТА
п'еса ў 3-х актах, 7 карцінах.

Маскоўскі Дзяржаўны цыганскі тэатр «РОМЭН» (памяшк. Белдзярждрамтэатра)
5 чэрвеня
ВЕЧАР НАРОДНАЙ ЦЫГАНСКАЙ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ
Каса адкрыта з 12—2 і з 5—9 г. в.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
ЗАНГЕЗУР

Кінотэатр «Пролетарый»
«ПЕТЭР»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ПЕРШЫ ЎЗВОД

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ПАД ДАХАМІ ПАРЫЖА

Дзіцячы кінотэатр
ГРАНІЦА НА ЗАМКУ

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Журнал Саюзкінохронікі № 24.
2. Журнал Белдзяржкінохронікі «Пазыка магутнасці»
3. Бясклопатныя мышкі.

НАРКАМЗЕМ БССР ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, ШТО
ІНКУБАТАРНА-ПТУШКАВОДНЫЯ СТАНЦЫІ
ПРАДАЮЦЬ
сутачных куранят
ПАРОДЫ
„БЕЛЫ ЛЕГОРН"
Цана за куранё—1 руб.

ПРОДАЖ КУРАНЯТ праводзіцца таксама ў АБМЕН НА ЯЙКІ ад племянных кур. У гэтым выпадку за кожнае куранё патрэбна здаць на інкубатарную станцыю 2 яйкі і дапланіць 25 кап., за беспародныя — 35 кап.

Куранята прадаюцца з інкубатарна-птушкаводных станцый, якія знаходзяцца ў наступных гарадах:
у МЕНСКУ, па вул. Апанскага, 76;
у ГОМЕЛІ па вуліцы Нямецкай, 9;
у ОРШЫ, па вул. Совецкай, 28;
у ПОЛАЦКУ, па вул. Махіраўскай, 30;
у СЛУЦКУ, па вул. Парыжскай комуны, 43;
у БАБРУЙСКУ, па вул. Цагельнай, 14;
у БАРЫСАВЕ, па вул. Розы Люксембург, 11/26;
у КАЛІНКАВІЧАХ — на інкубатарнай станцыі,
а таксама ў раённых цэнтрах — КРЫЧАВЕ, ГАРАДКУ і АСІПАВІЧАХ.

Куранята прадаюцца калгасам, саўгасам, калгаснікам, рабочым, служачым і аднаасобнікам у неабмежаванай колькасці на працягу МАЯ І ЧЭРВЕНЯ месяцаў.

Жадаючыя атрымаць дадатковую інфармацыю могуць звяртацца: Дом Урада, Наркамзем БССР, пакой № 18, тэл. № 25-125, або непасрэдна на інкубатарныя станцыі.

НАРКАМЗЕМ БССР.

ДЗЯРЖЦЫРК
(парк імя Горкага, тэл. 22-725).
Сёння
ВЯЛІКАЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ
у 3-х аддзяленнях.
Пачатак у 9 г. вечара.
Каса адкрыта з 12 да 2 г. і з 5 да 9 г.
Прымаюцца ЗАЯЎКІ на пастаянныя месцы са скідкай 25 проц.

БЕЛКАНТОРЫ ПРОМБАНКА
патрабуюцца
МАШЫНІСТКА І КІРАЎНІК СПРАЎ на пастаянную работу. Звяртацца ў кантору банка, Ленінская, 36/28.

ПЛЯЦ ВОЛІ
МАСКОЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗВЯРЫНЕЦ
АДКРЫТ ШТОДЗЁННА
з 9 г. ран. да 11 г. веч.
5 і 6 чэрвеня
АПОШНІЯ 2 ГАСТРОЛІ
Неўстрашымага ўкраінцеля МАКСА з групай ЛЬВОЎ-велікана.
Штодзённа 3 выступленні: у 12 г., 5 г. і 9 г. веч.
ДЫРЭКЦЫЯ.

СПЯШЫЦЕ БАЧЫЦЬ!

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ «САЮЗОРГУЧОТ»
абвяшчае НАБОР КУРСАНТАЎ
на 5-месячныя КУРСЫ
па падрыхтоўцы ІНСТРУКТАРОЎ-БУХГАЛТАРОЎ ПА КАЛГАСНАМУ ЎЧОТУ ДЛЯ РАЙЗА І МТС.
На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж рахунковай працы па шматвойнай сістэме не ніжэй 2-х год і асвету не ніжэй 7 класаў.
Прыём праводзіцца па камандзіроўках райза, МТС і індывідуальна. Стыпендыя ад 125 да 175 р. у месяц (у залежнасці ад паспяховасці) і 40 рублёў у месяц кватэрных.
Паступаючыя прадстаўляюць наступныя дакументы: засведчаную анкету, метрычны выпіс, пасведчанне аб адукацыі, даведкі аб стане здароўя, аб працоўным стажы ў галіне рахункаводства, аб вызваленні з апошняга месца работы і паштовых марак на 40 кап. для адказу.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 20 ЧЭРВЕНЯ. Яўка на іспыты па выкліку камбіната. Праезд на іспыты камбінатам не аплачваецца.
Даведкі можна атрымаць з 11 да 2 г. дня.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Рэволюцыйная, 3 (ва двары), навучальнаму камбінату «Саюзоргучот».
ДЫРЭКЦЫЯ.

СМАЛЕНСКІ СТАМАТАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае
ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1 курс 1938-39 вучэбнага года.
ІНСТЫТУТ РЫХТУЕ Ў РАЧОЎ-СТАМАТОЛАГАЎ, СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА ХВАРОБАХ ЗУБОЎ, ПОЛАСЦІ РОТА І ЧЭЛЮСНА-ТВАРАВАЙ СІСТЭМЫ.
У інстытут прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год, скончыўшыя поўную сярэднюю школу, рабфак, тэхнікум.
ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 4 ГОДЫ.
Прыём заяў у інстытут з 20 чэрвеня да 1 жніўня.
Да заявы прыкласці: а) табіяграфію, пасведчанне аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (арыгінал), тры фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору, размерам 3 х 4 см.) з уласнаручным подпісам, засведчаныя дзяржуста новай, даведку аб адносінах да вайсковага абавязку, пашпарт (прад'яўляецца пры асабістай яўцы).
Іспыты — з 1 па 20 жніўня — па наступных прадметах: па рускай мове (пісьмовы твор, граматыка, літаратура), матэматыцы, фізіцы, хіміі, палітграмаце і па адной з замежных моў (па выбару паступаючага). Ад іспытаў аслабаняюцца асобы, скончыўшыя поўную сярэднюю школу на выдатна.
75 проц. новага набору забяспечваецца стыпендыяй. Іншагароднім студэнтам прадастаўляецца інтэрнат.
Заявы накіроўваць па адрасу: г. Смаленск, Ленінская, 8, Стаматалагічны інстытут. Тэл. 3-21-65.
ДЫРЭКЦЫЯ.

СМІЛАВІЦКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ТЭХНІКУМ ПАЛЯВОДСТВА
абвяшчае ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на 1 курс.
ТЭХНІКУМ РЫХТУЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СЯРЭДНЯЙ КВАЛІФІКАЦЫІ—АГРАНОМАЎ-ПАЛЯВОДАЎ.
Тэрмін навучання 4 годы.
На 1 курс тэхнікума прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 30 год, маючыя падрыхтоўку не ніжэй НСШ (сямігодкі).
Заявы аб залічэнні прымаюцца з 1 чэрвеня да 18 жніўня.
Да заявы павінны быць прыкладзены: пасведчанне аб сканчэнні НСШ (абавязкова ў арыгінале), даведка аб здароўі, даведка аб годзе нараджэння, дзве фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору) з уласнаручным подпісам, засведчаныя дзяржаўнай установай, паштовых марак на 40 кап. для адказу.
Усе паступаючыя ў тэхнікум падвяргаюцца прыёмным іспытам у аб'ёме НСШ па матэматыцы, фізіцы, беларускай і рускай мовах і літаратуры, фізічнай геаграфіі і Канстытуцыі СССР па праграмах, устаноўленых НКЗ СССР.
Асобы, скончыўшыя ў 1938 г. НСШ з выдатнымі адзнакамі па вышэйпамянёных прадметах, прымаюцца ў тэхнікум без іспытаў.
Прыёмныя іспыты з 19 па 28 жніўня.
Пачатак заняткаў з 1 верасня.
ПРЫНЯТЫЯ Ў ТЭХНІКУМ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА СТЫПЕНДЫЯЙ У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД КУРСА І ПАСПЯХОВАСЦІ ад 55 да 90 руб. у месяц, ІНТЭРНАТАМ І СТАЛОВАЙ.
Тэхнікум знаходзіцца ў 34 км. ад гор. Менска. Маршрут паездкі: Менск, а з Менска аўтобусам да м. Смілавічы, або ст. Рудзенск, Бел. чыг.—Смілавічы.
Заявы з дакументамі падаюцца на імя дырэктара тэхнікума па адрасу: пашт. аддз. Смілавічы, Смілавіцкаму с.-г. тэхніку му паляводства.
Пры асабістай яўцы ў тэхнікум на прыёмныя іспыты, паступаючыя павінны мець пашпарт.
ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

АБВЯШЧАЕЦЦА ПРЫЁМ на першы курс у фінансава-эканамічныя інстытуты НКФ СССР,
ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ГАРАДАХ:
ЛЕНІНГРАДЗЕ — канал Грыбаедава 30/32.
ІРКУЦКУ — вул. Леніна 15/17.
РАСТОВЕ на-ДАНУ—Энгельса 77.
КАЗАНІ — вул. К. Маркса 43.
САРАТАВЕ — вул. Сако і Ванцэці, 15.
ТАШКЕНЦЕ — вул. Арпа-Пая 91.
ХАРКАВЕ — вул. Л. Берыя 7.
Умовы прыёму можна атрымаць па ўказаных адрасах.
НКФ СССР.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛ. № 25-384

Уп. Галоўлітбела № Р—1005. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая 49. К., Л., Ш.